Пераможцы прэміі ADAMI аб'яўленыя ў Кішынэве:

Бліскучая Гала цырымонія ўзнагароджання пераможцаў за культурніцкую разнастайнасць у краінах Усходняй Еўропы

У мінулы чацвер у Кішынэве, сталіцы Рэспублікі Малдова ADAMI Медыя прыз за культурніцкую разнастайнасць ва Ўсходняй Еўропе правяла Гала цырымонію ўзнагароджання.

Рэжысёры з Малдовы ўзялі дзве з шасці ўзнагарод, па 2000 еўраў кожная. Веллерыў Андрыцэ атрымаў ADAMI Медыя прыз за свой кароткі фільм ***«Дарагія сябры»*** у катэгорыі **«ТВ Забаўляльныя праграмы»**. Дакументальны фільм Еўжэніў Паповічы ***«Вялікі тэатр Сарокі»*** перамог у катэгорыі **«ТВ Інфармацыя»**. Дзве ўзнагароды атрымала Грузія: у катэгорыі **«ТВ Навіны/ Кароткія фільмы нон-фікшн»** перамог фільм ***«Вежа»*** Саламэ Джашы, а лепшым у катэгорыі **«Вэб відэа»** журы прызнала фільм ***«Правілы жыцця Горана»*** Анастасіі Славінскай.

Беларусь і Украіна таксама не адправіліся дадому з пустымі рукамі. Мыкола Гаманюк атрымаў узнагароду **«Лепшы сайт»** за вэб старонку ***«Шлях праз культуру: этнічныя туры па Хесону і Южнай Украіне»***. Кароткі фільм Нэлы Васілеўскай ***«Сябры па ліставанню»*** атрымаў прыз **«Малады ADAMI»** для Беларусі.

ADAMI Медыя прыз з'яўляецца найбольш значнай узнагародай для тэлежурналістаў, рэжысёраў і інтэрнэт вытворцаў з краінаў Усходняга партнёрства Еўразвязу. Федэральнае міністэрства замежных справаў і Pro Credit Holding (Франкфурт) фінансуюць прэмію як частку падтрымання грамадзянскай супольнасці і яе пашырэння ў гэтых краінах.
Больш за **300 заявак** былі атрыманыя на конкурс ADAMI Media Prize у гэтым годзе, з якіх міжнароднае журы адабрала **16 намінантаў**. Іх запрасілі на гала ў Кішынэў.

У сваёй прывітальнай прамове прадстаўнік АБСЕ па пытаннях свабоды медыяў, спадар **Гарлем Дэзір** адзначыў, што ён быў уражаны разнастайнасцю тэмаў, якія прадстаўлены на прэмію ў гэтым годзе.

Адной з найбольш прыкметных палітычных дзяячак, якая ўзяла ўдзел у гала цырымоніі ADAMI, што праходзіла ў Арганнай залі Кішынэву, была спадарыня **Рэбэка Хармс**, сустаршыня Парламенцкай Асамблеі Еўранэст. У сваім вітанні спадарыня Хармс казала пра павагу да культурніцкай разнастайнасці. Яна прывяла лозунг Еўрапарламенту: «Еднасць у разнастайнасці».

ADAMI Медиа Приз за культурное разнообразие в Восточной Европе
ул. Габашвили, 14 Е.
0108, Тбилиси, Грузия
Инициатива ForschungsgruppeModellprojekte e.V., 69469 Вайнхайм, Германия.

Контактная информация
office@adamimediaprize.eu
+995 322984072
www.adamimediaprize.eu

У дадатак да прэміі, тры маладыя журналісткі былі ўзнагароджаныя стыпендыямі для працягнення сваёй адукацыі ў медыях Нямеччыны: **Марыям Шэліа** (Украіна) і **Анна Глушко** (Малдова) правядуць 4 тыдні, працуючы разам з украінскімі і расейскімі калегамі ў Deutsche Welle у Бонне. **Олеся Ярэмчук** (Украіна) атрымала стыпендыю ў рэдакцыі MDR «Акно на Ўсход» у Ляйпцыгу.

Гала цырымонію правялі Актаў Тарлапан, Тэлерадыё Малдова; Ксенія Стужук, украінскае тэлебачанне; Лікай Еўгенідзэ, грузінскай тэлевядоўцай. Музычныя паўзы былі прадстаўленыя «малдаўскай Эдыт Піаф» – Лідзіяй Ісак і арганісткай Анай Стрэжавай.

Падчас ADAMI TALKS – сімпозіуму, які адбыўся ў Парламенце Рэспублікі Малдова раніцай, напярэдадні гала-цырымоніі, спадарыня Хармс казала пра небяспеку прапаганды, навінаў-падробак і варожай мовы для развіцця дэмакратыі. У сімпозіуме ўзялі ўдзел малдаўскія студэнты, а праз стрым – і іншыя студэнды краінаў Усходняга Партнёрства. Сярод выступоўцаў былі таксама карэспандэнт DW у Маскве Міадраг Сорык, медыяэксперт з Лондану Зураб Кодалашвілі і дырэктарка карэспандэнтскага пункту ARD у Маскве Іна Рук.

На наступны дзень пасля цырымоніі тэлебачанне «Малдова 1» запрасіла пераможцаў і сябраў журы ADAMI, а таксама выступоўцаў ADAMI TALKS на ток-шоу «Buna Seara». Разам з праграмным дырэктарам прэміі Штэфанам Толцам, госці абмяркоўвалі, як ADAMI адкрывае прасторы для ўзаемадзеяння з замежнымі вяшчальнікамі і даруе новыя магчымасці для малдаўскіх журналістаў і кінематаграфістаў.

Конкурс ADAMI Media Prize праводзіцца кожныя два гады, узнагароджваючы выбітную тэлевізійную і інтэрнэт прадукцыю, якая тычыцца культурніцкай разнастайнасці, нацыянальных, этнічных ці рэлігійных меншасцяў. ADAMI таксама палягчае камунікацыю і нэтворкінг сярод медыяпрафесіяналаў з Усходняй і Заходняй Еўропы праз майстэрні і сустрэчы ў фармаце дыялогу.

Цырымонія ўзнагароджання гэтага году прайшла пад эгідай Генеральнага сакратара Савету Еўропы, спадара Тарб'ёна Ягланда, пад патранажам Старшыні Парламенту Малдовы Андрыяна Канду і прадстаўніка АБСЕ па пытаннях свабоды медыяў, спадара Гарлема Дэзіра.

Гала цырымонія наступнай прэміі ADAMI Media Prize адбудзецца восенню 2020 году ў сталіцы Грузіі Тбілісі.

ADAMI Медиа Приз за культурное разнообразие в Восточной Европе
ул. Габашвили, 14 Е.
0108, Тбилиси, Грузия
Инициатива ForschungsgruppeModellprojekte e.V., 69469 Вайнхайм, Германия.

Контактная информация
office@adamimediaprize.eu
+995 322984072
www.adamimediaprize.eu